Источник: "Настаўніцкая газета" - 2012-12-22

**Вызначаны пераможцы XX Абласнога конкурсу навуковых біёлага-экалагічных работ навучэнцаў. Арганізатарамі спаборніцтва, у якім прынялі ўдзел 50 школьнікаў — членаў навуковых таварыстваў, гурткоў, секцый і іншых аб'яднанняў, выступілі ўпраўленне адукацыі і аддзел па справах моладзі Брэсцкага аблвыканкама, абласны камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя і абласны эколага-біялагічны цэнтр навучэнцаў.**

# Харчовыя дабаўкі пратэсціруе дразафіла

— Мэта конкурсу — выяўленне і падтрымка навучэнцаў, здольных да правядзення даследчых работ, пашырэнне і паглыбленне ведаў асноў навук біёлага-экалагічнага цыкла, павышэнне інтарэсу дзяцей да прыродазнаўчых прадметаў, самастойных даследаванняў і навуковых пошукаў, вывучэння методыкі эксперымента, а таксама падрыхтоўка да работы ў галіне тэарэтычнай і практычнай навукі, — расказала дырэктар Брэсцкага абласнога эколага-біялагічнага цэнтра навучэнцаў І.М.Жуковіч. — На конкурс падаваліся навуковыя работы навучэнцаў, якія з'яўляюцца вынікам уласных даследаванняў па вывучэнні і захаванні біялагічнай разнастайнасці і прыродных біяцэнозаў, вырашэнні лакальных і рэгіянальных праблем, выкарыстанні біялагічных і экалагічных тэхналогій і метадаў. Усе даследаванні закраналі актуальныя праблемы сучаснай біялогіі і экалогіі.

Абарона конкурсных работ, якія ацэньвалі выкладчыкі БрДУ імя А.С.Пушкіна і БрДТУ, навукоўцы Палескага аграрна-экалагічнага інстытута НАН Беларусі, праходзіла па 4 секцыях: "Агульная экалогія і водныя экасістэмы", "Экалогія жывёл і грыбоў", "Экалогія раслін" і "Сацыяльная экалогія і энергазберажэнне". Журы конкурсу ўлічвала навізну і навуковую каштоўнасць даследаванняў, іх актуальнасць і практычную значнасць, самастойнасць выканання і кампетэнтнае выкладанне матэрыялу, узровень афармлення навуковых дакладаў і наглядных матэрыялаў.

Дыпломы I ступені ў розных секцыях атрымалі адзінаццацікласніца Яна Тарэлка з пінскай сярэдняй школы № 15 ("Праблемы захавання і ўтылізацыі цвёрдых бытавых адходаў на тэрыторыі Пінскага раёна"), дзевяцікласніца Кацярына Карпук з брэсцкай сярэдняй школы № 27 ("Аналіз відавога складу прадстаўнікоў аддзела голанасенных цэнтральнай часткі Брэста і мікраараёна Рэчыца, якія выкарыстоўваюцца ў зялёным будаўніцтве"), дзевяцікласнік Дзмітрый Гулько і васьмікласнік Уладзіслаў Людчык з баранавіцкай гімназіі № 5 ("Беларуская энергетыка: школьны вопыт") і дзесяцікласніца Ганна Дзямянцей з брэсцкай гімназіі № 2 ("Небяспечныя харчовыя дабаўкі: біятэсціраванне з выкарыстаннем дразафілы і маніторынг утрымання ў прадуктах харчавання").

**Падрыхтаваў Сяргей ГРЫШКЕВІЧ.** *hryshkevich@ng-press.by*

Сяргей Грышкевіч. Харчовыя дабаўкі пратэсціруе дразафіла